Міхась ДАНІЛЕНКА

# Конь на асфальце

Ён лічыўся можа адным з паказальных дзіцячых садкоў у горадзе. Сюды часцяком прывозілі выхавацелек (часам і нянечак) паглядзець на роўненька падстрыжаныя газоны, на гіпсавых лебедзяў з прыгожа выгнутымі шыямі. У двары тут з ранняй вясны, амаль не перапыняючыся, цвілі кветкі. Калі адцвіталі вяргіні, радавалі вока мальвы, пятуніі, касачы, астры. Дзядуля адной з дзяўчынак — Соні — аднойчы доўга шчыраваў — адмыслова маляваў на сценах альтанкі матылёў з шырачэзна раскінутымі крыламі. Здавалася: падзьме мацней летні ветрык, і матыль узмахне крыламі, адарвецца ад халоднай паверхні сцяны альтанкі і ўзмые ў блакіт неба...

Калі каля таго матыля праходзіла загадчыца Марыя Іванаўна, заўсёды ўздыхала і пяшчотна гладзіла Соніну галоўку. Другі ўжо год, як адышоў у іншы свет яе дзядуля — самы лепшы сябра іхняга садка...

Колькі дзён лупілі спорныя дажджы. Дзе-нідзе на тратуарах з’явіліся лужыны. Трава ў двары, дзе пад наглядам выхавацелек гуляла дзятва, загусцела, з’явіліся прыкметныя “каласы” конскага шчаўя. Дзьмухаўцы адцвіталі — вакол насіўся ад іх пух, а гэтае пустазелле ды “пастухова сумка” лезлі ва ўсю. Па просьбе Марыі Іванаўны неяк раніцай да іх у двор завітаў прысадзісты касец з гідраўлічнай касой.

— Такой бяды, — акінуў ён поглядам навокал. — Не пускайце толькі да мяне сваіх карапузікаў, — пажартаваў. — Скашу за мілую душу.

І праўда: вадзіў касою без адпачынку. Калі ўсё было скошана, перабраўся ў суседні двор. Тут абапал выкладзеных пліткай дарожак, таксама шпарка пайшло ў рост разнатраўе. Касец праводзіў перад сабою паўкругам касу, і пад цяжкі гул яна пакідала пасля сябе роўныя рады скошанай травы. Акуратна абкасіў і тры яблыні, што раслі ў двары з тых часоў, як у новыя камяніцы засяліліся людзі.

Аднойчы перад абедзеным сном да загадчыцы ўбегла выхавацелька Ніна:

— Марыя Іванаўна, — заспяшалася расчырванелая жанчына. —Ледзь не ўсе дзеткі ў суседні двор пабеглі. — Што за дзіва? — паднялася тая. — Цыган на кані прыехаў па траву. Каб, крый Божа, чаго не здарылася.

Загадчыца падхапілася і следам за Нінай подбегам пашыбавала ў бліжні двор. Жанчына ведала: паблізу, за возерам, у асабістых дамах атабарыліся колькі цыганскіх сем’яў. І раней — бывала да смеццевых скрыняў часам пад’язджаў на падводзе чарнавусы дзяцюк, корпаўся там, а потым нешта перакладваў у павозку.

У двары сапраўды вакол каня мітусіліся дзеці. Пад яблынямі ахапкамі (не граблямі, а рукамі) зграбаў траву кучаравы мужчына. А дзяўчынкі і хлопчыкі настойліва падсоўвалі каню свежую траву. Ля конскай пысы першай стаяла Соня.

— Ён у мяне рахманы, — патлумачыў спалоханым жанчынам гаспадар. — Ведаеш, як клічуць? — Як? — Жэўжыкам. Марыя Іванаўна з Нінай

засмяяліся. Яны так часам любоўна называлі сваіх неслухаў, калі тыя не хацелі лажыцца спаць днём.

Загадчыца разумела маленькія дзіцячыя душы: гэта ж многія з іх можа толькі ў кніжках ды і кіно бачылі каня. А ён вось стаіць і адмахваецца ад мух. Лічы на асфальце. І яго гладзяць далікатныя дзіцячыя далонькі.

— Мяне завуць дзядзька Коля, — падаў мужчына Марыі Іванаўне руку. — Вось змайструю дома грабелькі, дык у вольную хвіліну на двары вашага садка збудую казачны церамок. Я ж езджу тут зрэдку. — Праўда? — не паверыла Ніна. — Дзядзька Мікалай ніколі не хлусіць.